# ЗІМОВЫ ДЗЯНЁК, ШТО КАМАРОЎ НАСОК



**Мы працягнем чытаць і вывучаць** творы пра прыгажосць зімы, пра забавы дзяцей у гэту пару года; пра захаванне нацыянальных традыцый і зімовыя святы.

**Мы будзем вучыцца:**

- ✓ вызначаць настрой паэтычных твораў;
- ✓ маляваць словамі карціны зімовай прыроды;
- ✓ вылучаць у тэксце вобразныя словы;
- ✓ выказваць свае адносіны да прачытанага;
- ✓ выразна чытаць вершы (захоўваць інтанацыю сказа, паўзы і патрэбны тон), перадаваць іх настрой.

**Варта задумацца.** Якія нацыянальныя традыцыі і святы з пакалення ў пакаленне захоўваюць беларусы ў зімовую пару года?



Правообладатель Национальный институт образования

***Шэ́рань*** — іней.
***Журбо́тна, марко́тна*** — сумна, тужліва.
***Хіста́ць*** — варушыць, трэсці.



ЯКУБ КОЛАС

## Зіма

Надышлі марозы,
Рэчкі закавалі,
Белыя бярозы
Шэранем убралі.

Замялі дарогі
Ветрыкі снягамі.
Лес, як дзед убогі
З доўгімі вусамі,

Апусціў галіны
І стаіць журботна,
Зрэдку верхавіны
Зашумяць маркотна.

Мяккая пярына
Вочы адбірае.
Белая раўніна —
Ні канца ні краю.


Правообладатель Национальный институт образования

Пад пялёнкай белай
Травы і лісточкі.
Рэчка анямела,
Змоўклі ручаёчкі.

Амярцвелі лозы,
Чуць галлём хістаюць.
А ў палях марозы
Ды вятры гуляюць.



1. Якія карціны зімы вы ўяўлялі ў час чытання? Вусна апішыце іх.
2. Як паэт апісвае рэчку, бярозы, дарогі і лес? Прачытайце адпаведныя радкі. Што аўтар гаворыць пра вятры і маразы?
3. Растлумачце сэнс сказаў: «Мяккая пярына вочы адбірае», «Рэчка анямела» і «Амярцвелі лозы». Якія яшчэ словы дапамаглі Якубу Коласу ажывіць зімовую карціну, наблізіць яе да паводзін чалавека? Знайдзіце іх і прачытайце.
4. З кім параўнаў аўтар зімовы лес? Прачытайце.
5. Якія словы ў творы рыфмуюцца? Знайдзіце і прачытайце іх.
6. Вывучыце верш на памяць.


Правообладатель Национальный институт образования

## У свеце прыгожага

1. Разгледзьце рэпрадукцыю карціны мастака Яўгена Балакшына «Катанне з горкі».



2. Адкажыце на пытанні.

1) Якая пара года адлюстравана на карціне? Па якіх прыкметах можна здагадацца?

2) Дзе адбываюцца падзеі: у вёсцы ці ў горадзе? Дакажыце.

3) Хто паказаны на пярэднім плане?

4) Як выглядаюць дзеці? Чым яны заняты? У што апрануты і абуты? Якія элементы іх адзення ўказваюць на даўні час падзей?

5) Чаму твары дзяцей радасныя і вясёлыя?

6) Як паводзіць сябе сабачка?

7) Якіх фарбаў — цёплых ці халодных — прысутнічае на карціне больш?



Правообладатель Национальный институт образования

## НАРОДНЫЯ ПРЫКМЕТЫ ПРА ЗІМУ

- Вароны садзяцца на верхавіны дрэў — будзе вецер.
- Калі вароны каркаюць — будзе мароз.
- Вераб'і дружна расчырыкаліся — пацяплее.
- Кошка — на печ, сцюжа — на двор.
- Зоркі ярка блішчаць — на мароз.
- Дым з коміна ідзе слупом — будзе мароз.
- Калі ноччу быў іней, днём снегу не будзе.
- У лютым востры мароз — кароткая зіма.

1. Прачытайце народныя прыкметы пра зіму. Запомніце адну з іх.
2. Якія народныя прыкметы пра зіму вы ведаеце?

---

**Маўленчая размінка.** У час чытання верша Івана Муравейкі правільна вымаўляйце гукі [дз'], [ў], [г], [ч].

### Сняжынкі-смяшынкі

Поўнай жменяю на Зінку
Сыпануў дубок сняжынкі:
Не сякучкі-халадзінкі,
Не пякучкі-маразінкі,
А вясёлыя смяшынкі.
— Ха-ха-ха, —
Смяецца Зінка
І сама трасе галінкі.





Правообладатель Национальный институт образования